ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
22 МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 19 (1283)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ

прэзідыума прафкома універсітэта. На ім былі заслуханы і абмеркаваны даклады старшыні прафкома М. М. Дразда і старшыні аздараўленча-спартыўнай камісіі С. А. Марозавай «Аб летнім адпачынку савецкіх і замежных студэнтаў у спартыўна-аздараўленчых лагерах».

Старшыня жыллёва-бытавой камісіі У. І. Шык расказаў аб размеркаванні жылой плошчы ў інтэрнатах.

### ПЫТАННІ ЛЕТНЯГА АДПАЧЫНКУ

савецкіх і замежных студэнтаў і яго арганізацыі былі разгледжаны на апошнім пасяджэнні рэктарата. Перад прысутнымі выступілі прарэктар па замежных сувязях І. П. Чэпа і старшыня прафкома універсітэта М. М. Дрозд.

Пасля гэтага загадчык паліклінічнага аддзела М. І. Цырульнікава пазнаёміла са станам медыцынскага абслугоўвання і аховы здароўя студэнтаў універсітэта.

### АБ РЭАЛІЗАЦЫІ

крытычных заўваг, выказаных камуністамі на справаздачна-выбарным сходзе, гаварылася на апошнім партыйным сходзе гістарычнага факультэта. Заслуханы даклад намесніка сакратара партбюро В. А. Андруховіча. Былі распрацаваны мерапрыемствы, устаноўлены тэрмін ліквідацыі недахопаў.



Старшы навуковы супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі А. М. Аншакоў, студэнт У. Гурыновіч і старшы выкладчык У. А. Чудакоў праводзяць эксперымент. Матэрыял аб іх распрацоўках чытайце на 2-й старонцы.

Фота М. ДУБОВІКА.

ТОЛЬКІ ФАКТ

## Навука — вытворчасці

ЗА БЯГУЧУЮ ПЯЦІГОДКУ на розныя выстаўкі Белдзяржуніверсітэт прадставіў 83 экспанаты, якія адзначаны 28 медалямі ВДНГ СССР, 63 дыпломамі ВДНГ БССР. Распрацоўкі вучоных універсітэта дэманстраваліся на міжнародных выстаўках у Англіі, Венгрыі, Індыі, Італіі.

***

БДУ ВЫКОНВАЕ сумесныя даследаванні па дагаворах аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з ВНУ ГДР, Балгарыі, Польшчы, Югаславіі.

***

ВУЧОНЫМІ УНІВЕРСІТЭТА атрыманы новыя фотаматэрыялы, якія абаронены 30 аўтарскімі пасведчаннямі. Яны дазваляюць скараціць расход серабра ў 40 разоў або выключыць яго поўнасцю з фатаграфічнага працэсу. Чакаемы эканамічны эфект — звыш пяці мільёнаў рублёў у год.

***

РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА тэматыка па 41 навуковаму напрамку. Тэматыка даследчых работ вырашае навукова-тэхнічныя праблемы народнай гаспадаркі. Па важнейшай тэматыцы выконваецца 64 дагаворных і 67 дзяржбюджэтных тэм. Планы ўсіх дзяржбюджэтных работ скаардынаваны з планамі даследаванняў АН СССР і АН БССР. Звыш 95 працэнтаў работ накіравана на стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі і тэхналогіі.

Падрыхтаваў М. ЛАХВІЧ.

ПАЗЫЎНЫЯ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

## «СПАДЧЫНА» — ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСУ

«СПАДЧЫНА». Так назвалі сваю газету байцы зводнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола Беларусі. На яе старонках студэнты расказалі пра свайго ганаровага байца Мікалая Дворнікава, падзяліліся ўспамінамі аб мінулай рабоце ў СБА, вызначылі план мерапрыемстваў на гэтае лета. Знайшла сваё адлюстраванне і работа атрада ў падрыхтоўчы перыяд. Гэта — суботнікі па добраўпарадкаванню студэнцкага кафэ, цікавыя лекцыі, якія былі прачытаны на розных прадпрыемствах і ва ўстановах горада, збор кніг для будаўнікоў БАМа, выступленне агітбрыгады (дарэчы, на агульнауніверсітэцкім аглядзе яна заняла другое месца) і інш.

І вось нядаўна камандзір атрада П. Аксючыц павіншаваў студэнтаў з радаснай весткай: газета атрада, заняўшы першае месца ў аглядзе-конкурсе друку СБА універсітэта, выйшла таксама пераможцай конкурсу газет будаўнічых атрадаў Мінскай вобласці.

В. ЧАРНУШЭНКА.

## ТЫДЗЕНЬ СБА

Ён праводзіўся згодна з пастановай Мінскага абласнога штаба СБА і меў асноўнай мэтай актывізаваць работу камсамольскіх арганізацый ВНУ па падрыхтоўцы да трэцяга працоўнага семестра. У ходзе тыдня былі праведзены розныя мерапрыемствы.

У аглядзе-конкурсе агітацыйна-мастацкіх брыгад пераможцамі выйшлі агітбрыгады СБА імя Гарыбальдзі і імя Пічэты (гістарычны факультэт), «Спадчына» (механіка-матэматычны факультэт) і зводнага СБА імя Ленінскага камсамола Беларусі.

У спаборніцтвах у рамках спартакіяды перамагла дружная каманда СБА «Кастрычнік» (гістарычны факультэт — камандзір атрада Андрэй Гарбацкі).

Сярод насценных газет лепшай была прызнана газета СБА імя Ленінскага камсамола (камандзір атрада Пётр Аксючыц).

Самы змястоўны санітарны бюлетэнь быў выпушчаны санактывістамі СБА «Градыент» (механіка-матэматычны факультэт).

У ходзе тыдня СБА былі праведзены суботнікі па добраўпарадкаванню алімпійскіх аб'ектаў, па азеляненню горада.

А. ШЫБУТ,
начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.

## БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

**ЛІЧБАВЫ платнамер лёгкіх асяроддзяў, створаны групай вучоных кафедры ядзернай фізікі нашага універсітэта... Вельмі чакалі яго гляцыёлагі (даследчыкі леднікоў і снега-лёдавых утварэнняў) для вымярэння шчыльнасці снегу, ільду, фірну ў высакагорных умовах. Сучасныя леднікі займаюць каля 11 працэнтаў сушы. Таму гляцыялагічныя даследаванні маюць практычнае значэнне для асваення тэрыторыі і будаўніцтва ў палярных і горных раёнах. Вучоныя-гляцыёлагі даследуюць не толькі раёны Каўказа, Алтая, Сярэдняй Азіі, Урала, але і ледніковы покрыў Антарктыды. Вось і сёлета, з кастрычніка 1979 па красавік 1980 года, працавала XXV савецкая Антарктычная экспедыцыя. На гэты раз у сваёй рабоце гляцыёлагі выкарыстоўвалі платнамер, распрацаваны групай вучоных універсітэта на чале са старшым выкладчыкам У. А. Чудаковым.**

— Ведаеце, у час нашага паходу да Паўднёвага геамагнітнага полюса ў якіх толькі экстрэмальных умовах мы яго не выпрабоўвалі. На станцыях «Усход» і «Піянерская», на полюсах «Холаду» і «Магнітным» тэмпература даходзіла да 65 градусаў марозу. Платнамер працаваў стабільна, паказанні былі дакладнымі. І вы не можаце сабе ўявіць, — тут Юрый Мікалаевіч усміхаецца і задаволена працягвае, — як прыемная асацыяцыя па вывучэнню Антарктыды, інстытут Арктыкі і Антарктыды і іншыя. А гэта ўжо многае значыць. І таму зараз, на наш погляд, галоўная задача заключаецца ў шырокім укараненні яго ў вытворчасць.

...Неяк да вучоных звярнуліся інжынеры Мінскага завода халадзільнікаў. Ім патрэбна была прылада, якая б дазваляла вымяраць шчыльнасць цеплаізаляцыі, ад якой у многім залежыць надзейнасць халадзільніка.

# ПЛЁН ПОШУКУ

...Яны хваляваліся. Хваляваліся таму, што раптам прылада не вытрымае выпрабавання. Здавалася, гарантыя на тое, што платнамер будзе працаваць, ёсць. Эльбрус і Далёкі Усход, Каўказ і Памір— тут ім ужо карысталіся. І ўсё ж... Засмучала тое, што на гэты раз тэмпература будзе ніжэй 60 градусаў марозу. І вось доўгачаканы званок з Ленінграда:

— Усё ў парадку. Прыеду, раскажу.

Гэта быў Ю. М. Емяльянаў, старшы навуковы супрацоўнік кафедры возеразнаўства геаграфічнага факультэта. Юрый Мікалаевіч у саставе экспедыцыі ездзіў у Антарктыду. Ён ведаў, з якой нецярплівасцю чакаюць на кафедры вынікаў. Таму, як толькі вярнуліся, тут жа пазваніў.

— Чакалі з нецярплівасцю,— гаворыць Уладзімір Андрыянавіч Чудакоў.—Хутчэй хацелася даведацца аб усім як мага падрабязней...

І вось сустрэча.

...на было бачыць тое, наколькі лягчэй стала працаваць вучоным-гляцыёлагам. Зручней, ды і часу на вымярэнне шчыльнасці снегу і льду зараз трацілася значна менш.

— Раней усё гэта рабілася ўручную, — дадае Уладзімір Андрыянавіч. — Капалі яму на патрэбную глыбіню, бралі снег і, вымераўшы аб'ём і вагу, вызначалі яго шчыльнасць. На гэта ішло шмат часу. Даныя былі прыблізнымі. У час даследаванняў форма снегу парушалася, таму і вынікі не маглі быць правільнымі.

— Экспедыцыя працягвалася больш 6 месяцаў, але на ўліку была кожная хвіліна. Прайсці трэба было больш 2 тысяч кіламетраў. Ды і назад столькі ж. Таму асабліва марудзіць не было часу...

XXV савецкая Антарктычная экспедыцыя закончыла сваю работу. Зараз нашым платнамерам зацікавіліся Міжнародная асацыяцыя па вывучэнню гляцыялагічных з'яў, Міжнарод-

За распрацоўку такой прылады ўзяліся маладыя вучоныя БДУ Ю. Г. Конанаў, А. М. Аншакоў, П. Ф. Сафронаў. Патрэбна было спалучыць веды па ядзернай фізіцы, электроніцы і вылічальнай тэхніцы. Нешта атрымлівалася адразу, а над нечым і добра даводзілася «паламаць» галаву. Але надзеі не гублялі. І вось вынік — іх прылада прайшла вопытна-прамысловую праверку. Зараз укаранёна на Мінскім заводзе халадзільнікаў. Як бачым, і з гэтай задачай паспяхова справілася група вучоных пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка У. А. Чудакова.

Гэта толькі два прыклады з навукова-даследчай работы кафедры. Зараз вучоныя займаюцца новымі распрацоўкамі. Дык пажадаем жа ім поспехаў у іх цікавай, карыснай працы.

**Н. ЖУКАВА,**
**наш кар.**

## АБІТУРЫЕНТ: ПРАБЛЕМЫ І ПРАКТЫКА

# Клопат аб будучым папаўненні

АБІТУРЫЕНТ-80... Які ён? Што хвалюе яго сёння? Як дапамагчы яму здзейсніць мару, як дапамагчы стаць студэнтам? Пытанні гэтыя хвалююць усіх, і асабліва прыёмную камісію Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, якая ў сваёй рабоце ўзяла курс на развіццё форм паглыбленай прафарыентацыі. Бо для таго, каб падрыхтоўка высокаадукаваных спецыялістаў была на належным узроўні і адпавядала патрабаванням часу, трэба запрашаць ва універсітэт найбольш актыўную, творчую частку моладзі. З гэтай мэтай усе факультэты універсітэта складаюць індывідуальныя планы па прафесійнай арыентацыі, на аснове якіх мы плануем сваю работу. Акрамя таго, мы склалі пералік асобных звенняў універсітэта, якія ажыццяўляюць сістэматычную справаздачу перад прыёмнай камісіяй па прафарыентацыі.

Як вядома, да стацыянарных форм прафесійнай арыентацыі адносяцца: падрыхтоўчае аддзяленне і падрыхтоўчыя курсы. Камплектаванне падрыхтоўчага аддзялення здзяйсняецца згодна з месцамі, якія прадугледжаны планам, а камплектаванне падрыхтоўчых курсаў—з усіх жадаючых паступіць. Штогод на іх займаецца звыш 3,5 тысячы слухачоў. Падрыхтоўчыя курсы працуюць на працягу ўсяго вучэбнага года. Дадаткова ў чэрвені арганізуюцца спецыяльныя месячныя курсы для абітурыентаў.

Сістэматычна функцыяніруюць ва універсітэце школы юнага географа, хіміка, фізіка, матэматыка, карэспандэнта і шмат іншых. Сёлета ў дзесяці такіх школах праходзілі вучобу каля 1400 слухачоў. Выпускнікам гэтых школ выдаюцца запрашэнні для паступлення ва універсітэт. Так, напрыклад, з 200 выпускнікоў рэспубліканскай завочнай фізіка-матэматычнай школы запрашэнні паступаць у Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна атрымалі 150 чалавек.

Вялікая ўвага аддаецца і шэфскай рабоце ў школах. У падшэфных школах наладжваецца работа гурткоў і факультатываў, а таксама вядзецца індывідуальная работа са здольнай моладдзю. У інтарэсах прафарыентацыі выкарыстоўваюцца педагагічная і піянерская практыкі. Вучні школ запрашаюцца на агульнауніверсітэцкія і факультэцкія вечары адпачынку, у шматлікія спартыўныя секцыі, якія функцыяніруюць на базе універсітэта альбо добраахвотных спартыўных таварыстваў рэспублікі. Індывідуальная работа з вучнямі горада Мінска вядзецца з мэтай аказання ім дапамогі ў вучэбнай рабоце. У мінскай школе № 39, напрыклад, такую работу праводзяць студэнты біялагічнага, фізічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў. Вялікую работу ў гэтым напрамку праводзіць камітэт камсамола. Створаны і працуе кансультацыйны пункт, які дае пісьмовыя і вусныя кансультацыі для жадаючых паступіць. А з першага красавіка ва універсітэце пачала сваю работу грамадская прыёмная камісія.

Прафесійная арыентацыя шляхам агітацыйна-масавых мерапрыемстваў у школах уключае ў сябе падрыхтоўку лекцый, правядзенне гутарак, палітінфармацый і г. д. За 1979-80 навучальны год ва універсітэце было зроблена 52 выезды агітбрыгад і агітпрабегаў.

Агітацыйна-масавымі мерапрыемствамі было ахоплена звыш 2500 вучняў.

Важнай формай знаёмства з моладдзю з'яўляецца правядзенне «Дзён адкрытых дзвярэй». Яны адбываюцца ў маштабах універсітэта і кожнага з факультэтаў.

Штогод вядзецца вялікая работа па рассылцы матэрыялаў аб універсітэце ў школы рэспублікі, на прадпрыемствы, ва ўстановы. Толькі ў гэтым годзе такія матэрыялы былі разасланы ў 1800 школ, 470 камплектаў дакументацыі разасланы ў райана, райваенкаматы.

Думаецца, што гэта праца не будзе марнай. І ва універсітэт у гэтым годзе ўвальецца здольная, актыўная моладзь, якая жадае атрымаць грунтоўныя веды.

**М. БАЗЫЛЕЎ,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі.**

## ● КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

# ДЭПАНІРАВАННЕ РУКАПІСАЎ

ЦІ МАГЧЫМА паскорыць апублікаванне вынікаў навуковай работы? «Можна», — адказвае аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

На працягу 17 гадоў у Савецкім Саюзе функцыяніруе сістэма дэпаніравання рукапісаў навуковых работ вузкаспецыяльнай тэматыкі. Дзейснасць сеткі дэпаніравання пацвярджаецца няспынным ростам колькасці прынятых на дэпаніраванне рукапісаў. Так, напрыклад, у 1972 годзе Усесаюзным інстытутам навуковай і тэхнічнай інфармацыі (УІНТІ) быў прыняты на дэпаніраванне 251 рукапіс, у 1977 годзе — 3273, а ўсяго за шасцігоддзе—10956 рукапісаў.

Што такое дэпаніраванне?

Дэпаніраванне — новы метад публікацыі рукапісаў закончаных навуковых работ вузкаспецыяльнай тэматыкі па прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навуках. Органы інфармацыі захоўваюць рукапісы, выдаюць копіі па запытах спажыўцоў, а таксама публікуюць рэфераты або бібліяграфічныя апісанні рукапісаў у сваіх інфармацыйных выданнях.

Дэпаніраванне рукапісных работ па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках здзяйсняе УІНТІ, рукапісных работ па грамадскіх навуках — Інстытут навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках (ІНІГН).

Рашэнне аб перадачы на дэпаніраванне рукапісаў выносіцца саветамі факультэтаў, навукова-даследчых інстытутаў пры БДУ, саветам кафедр грамадскіх навук універсітэта па ўзгадненню з рэдкалегіяй журнала «Веснік БДУ».

Аўтар захоўвае за сабой права публікацыі матэрыялаў указаных работ у навуковых выданнях, але пры гэтым ён павінен паведаміць арганізацыі, якая выдае твор (выдавецтву, рэдакцыі журнала і г. д.), аб тым, што рукапіс быў дэпаніраваны, або ўпамянуць аб гэтым у рабоце, якая прапаноўваецца да выдання.

Рашэнне савета сапраўднае пасля зацвярджэння яго. прарэктарам па навуковай рабоце універсітэта.

Рукапіс накіроўваецца на дэпаніраванне са згоды яго аўтара.

Падрыхтоўка рукапісу да дэпаніравання ў адпаведнасці з «Інструкцыяй аб парадку дэпаніравання работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навуках» праводзіцца аўтарам, які прадстаўляе рукапіс у аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі (АНТІ) БДУ.

На дэпаніраванне прымаюцца рукапісы, якія дазволена адкрыта публікаваць (размнажаць).

Аб'ём артыкула не павінен перавышаць двух аўтарскіх аркушаў, манаграфіі—10 аўтарскіх аркушаў.

Інфармацыя арганізацый, прадпрыемстваў, вучоных і спецыялістаў аб дэпаніраваных рукапісах здзяйсняецца шляхам публікацыі рэфератаў (або бібліяграфічных апісанняў) гэтых рукапісаў у адпаведных рэфератыўных часопісах і бібліяграфічных указальніках.

Аўтарам рукапісаў, прынятых на дэпаніраванне, пасля апублікавання рэферата (бібліяграфічнага апісання) высылаецца даведка аб дэпаніраванні з указаннем прозвішча аўтара, назвы рукапісу, назвы і нумара навуковага рэфератыўнага зборніка, у якім апублікаваны рэферат.

Аўтары дэпаніраваных рукапісаў захоўваюць права, якое вынікае з заканадаўства аб аўтарскім праве, але не могуць прэтэндаваць на выплату ганарару.

Дэпаніраваныя рукапісы прыроўніваюцца да апублікаваных друкаваных выданняў.

Арганізацыі, якая прадставіла рукапіс да дэпаніравання, або аўтару па іх запытах, выдаецца адзін раз копія рукапісу бясплатна.

**В. МАКАРАНКА,**
**інжынер АНТІ.**

**● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ ●**

**Студэнты трэцяга курса біялагічнага факультэта на занятках практыкума па фізіялогіі чалавека.**

**Фота Л. КЛІМАНСКАГА.**



## ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ МУЗЕЯЎ







ПАСЛЯ СПЕКТАКЛЯ

# Трэцяя страла

ХТО ВІНАВАТЫ? Адказ на гэта пытанне можа быць розным: простым ці складаным, кароткім ці доўгім. Ва ўсякім выпадку на яго адкажа кожны, хто апынуўся ў той вечар у вялікай фізічнай аўдыторыі, дзе ўдзельнікі студэнцкага драматычнага тэатра праводзілі адкрытую рэпетыцыю спектакля па п'есе Аляксандра Валодзіна «Дзве стралы». Твора, глыбока філасофскага і складанага. Як па форме, так і па зместу. Дзеянне адбываецца ў сёмым тысячагоддзі да нашай эры. У першабытнаабшчынным ладзе.

...У забойстве Длiннага, храбрага воіна роду, абвінавачваецца Вушасты. Усё супраць яго: і калчан, які ён страціў у баі, і стрэлы, якія бачыў на забітым сябар Вушастага Даўганосік. Военачальнік патрабуе смерці Вушастага. Але ён ні ў чым не павінны і хоча ва ўсім разабрацца. Глава роду прабіраецца ноччу да Вушастага і гаворыць яму аб тым, што калі ён знойдзе сапраўднага забойцу, то будзе забіты сам. Але Вушасты ўпарта ідзе да сваёй мэты і дасягае яе. За гэтае выкрыццё ён плаціць сваім жыццём. У канцы п'есы глава роду пакідае родзічаў, бо разумее, што іх паразіла хвароба няроўнасці, улада адных над іншымі, хвароба, ад якой цяжка пазбавіцца. Такі вынік, такі фінал. Такая асноўная думка твора. І яе трэба было данесці да гледача, данесці да аўдыторыі. А гэта няпроста. Таму раней, яшчэ задоўга да выступлення, калі твор дэталёва разбіраўся і аналізаваўся, ўжо ішоў пошук. Нястомны і цяжкі. Пошук вобразаў і іх сцэнічнага вырашэння. Бо прытча-дэтэктыў А. Валодзіна «Дзве стралы» — твор надзвычай дынамічны. Ён адкрывае вялікія магчымасці для ўвасаблення ідэі, грунтуючыся на ўнутранай псіхалогіі героя, працэс выяўлення якой павінен ісці пры дапамозе ўсіх сродкаў эмацыянальнага ўздзеяння. І потым, калі ў працэсе творчага пошуку акрэслілася нешта агульнае, спачатку нават супярэчлівае, калі былі знойдзены і асэнсаваны характары дзеючых асоб, пластычнае і музычнае рашэнне ўсёй п'есы, пачаліся рэпетыцыі.

Мне пашанцавала. Я прысутнічаў на гэтых рэпетыцыях і бачыў, як цяжка даваўся кожны крок наперад, як з маленькіх кавалачкаў, паступова і няспынна складваўся агульны малюнак спектакля. І яшчэ мне пашанцавала ў тым, што пазнаёміўся з яго ўдзельнікамі, звычайнымі хлопцамі і дзяўчатамі, якія прыйшлі на студэнцкую сцэну, каб дакрануцца да тайны тэатра, каб яшчэ і яшчэ раз адчуць на сабе вялікую сілу мастацтва. Мастацтва, якое выхоўвае, робіць лепшым і акрыляе. Я памятаю першае знаёмства з ветэранамі тэатра—Сяргеем Мацкевічам і Віктарам Каратаем, размовы з Ігарам Шымуком, які стаў сапраўдным героем спектакля, бо фактычна за адну ноч вывучыў ролю і выдатна справіўся з вобразам; з Сяргеем Ляпічам і Аленай Зайцавай, Наталляй Фёдаравай і Пятром Марцавым і з многімі іншымі, для якіх тэатр стаў другім домам, стаў добрай школай чалавечых узаемаадносін. Я памятаю, як уважліва сачыў на рэпетыцыях за сваімі выхаванцамі галоўны рэжысёр студэнцкага драматычнага тэатра універсітэта В. Д. Анісенка, як пасля рэпетыцый збіраліся ўсе разам у невялічкім інтэрнатаўскім пакоі памочніка рэжысёра Д. Г. Тыцюк і спрачаліся, абмяркоўвалі тую ці іншую хвалюючую тэму. А іх было заўсёды шмат. І асабліва пра тэатр, пра тое, што было зроблена на сённяшняй рэпетыцыі. Марылі аб першым сур'ёзным выступленні, аб тым, якім яно будзе, і, безумоўна, верылі ў поспех. І ён прыйшоў, пасля першых апладысментаў, віншаванняў, кветак, пасля першых хвілін выступлення, пра якія потым В. Д. Анісенка шчыра скажа: «Гэта была зоркавая часіна нашага тэатра». І з ім нельга не пагадзіцца, бо вынік амаль гадавой напружанай творчай працы калектыву не мог быць іншым.

**Замест эпілога.** Акцёр — асоба творчая. І вырашае ён творчыя задачы, праблемы. Дэкарацыі, касцюмы, святло, музыка — клопаты іншых. Такі прынцып. Такі закон тэатра. Любога. Нават самадзейнага. Праўда, у апошнім можна абысціся і сваімі сіламі, але толькі пры цеснай сувязі з грамадскімі арганізацыямі. Гэтага якраз і не хапае студэнцкаму драматычнаму тэатру універсітэта. Усё, што робіцца ў ім, робіцца самастойна, робіцца толькі на энтузіязме яго ўдзельнікаў, якія ў час падрыхтоўкі да спектакля ператвараюцца ў швачак і электрыкаў, мастакоў і цесляроў, адміністратараў. І яшчэ тэатру патрэбна свая сцэна. Сапраўдная, не імправізаваная. І патрэбна дапамога. Таксама сапраўдная.

**С. ЛЫСКАВЕЦ,**
**наш кар.**

КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# КАЛІ ГАВАРЫЦЬ ПРА «САЛЯРЫС»

«ЯК СТВАРАЎСЯ наш калектыў? Баюся, што гэту праблему не ахопіш газетным артыкулам. Калі б сярод нас былі паэты, яны напэўна склалі аб «Салярысе» паэму...»

Ён прыніжае свае здольнасці, Міхаіл Міхайлавіч Фядэня, кіраўнік дружнага студэнцкага сельгасатрада. Ён і яго выхаванцы, студэнты 4-га курса факультэта прыкладной матэматыкі, валодаюць вельмі каштоўнай чалавечай якасцю — уменнем у кожнай дробязі нашага хуткага жыцця ўбачыць цудоўнае. Калісьці ім было вельмі цяжка. На шчасце, рабяты своечасова зразумелі, што адчужанасць і раз'яднанасць вырастаюць толькі там, дзе існуе пасіўнасць, а адсутнасць калектыву — элементарнае нежаданне яго ствараць.

...Яны правучыліся толькі месяц, і пачуццё трапяткога хвалявання, пастаянны спадарожнік на ўступных экзаменах, яшчэ не пакінула іх. Акуратна наведвалі лекцыі і семінарскія заняткі, правялі камсамольскі сход і нават арганізавалі культпаход. Але тут, у вёсцы, на «бульбе», яны зразумелі, што зусім чужыя. І жахнуліся.

Спачатку сумавалі, ім было нецікава. Яны прывыклі быць школьнікамі: усё за цябе зробіць класны кіраўнік — і ў кіно зводзіць, і гутарку правядзе, і дапаможа арганізаваць вечар адпачынку. Рабяты марылі аб стварэнні дружнага калектыву (склаўся ж ён у школе, хаця, я ўпэўнена, не кожны выпускны клас можа пахваліцца сапраўдным калектывам), але ў іх не хапала жыццёвага вопыту. Яны не разумелі галоўнага: ВНУ — не школа, ніхто за руку вадзіць не будзе. Іх хапала толькі на вучобу, хаця, як правіла, і вучоба ў галаву не вельмі пойдзе, калі ў групе пануе адчужанасць. Відаць, хвалюючае пачуццё ад разумення таго, што ты ўсё вытрымаў і паступіў у ВНУ, яшчэ заахвочвала іх у верасні. Але калі так магчыма было пратрымацца месяц-два ў сценах універсітэта, то тут, на сельгасработах, ім стала вельмі цяжка. Не, яны не працы спалохаліся. Працавалі сумленна, і шмат. Праўда, часта выбіваліся з сіл, нерваваліся. І працавалі кожны за сябе, не апіраючыся на моцнае плячо сябра. Добрасумленнай працы не хапала аптымізму. У сэрцах пачалі паяўляцца парасткі раўнадушша. Ды і жылі рабяты адасоблена. Неяк вечарам запланавалі пайсці ў клуб — жадаючых можна было пералічыць на пальцах.

Ім быў вельмі патрэбны старэйшы таварыш, кіраўнік. З яго пачынае зараджацца сапраўдны калектыў.

...Павольна рассцілалася над прыціхшай вёсачкай мяккае святло месяца. Вечар адпачынку сабраў у клубе і маладых і сталых. Было вельмі цесна, і рабят не пусцілі. Дык што, пройдзе дарма яшчэ адзін дзень, зноў трэба разыходзіцца па дамах і сумаваць? «Вышэй галаву, байцы! Усё залежыць толькі ад вас, — проста сказаў Адольф Фёдаравіч. — Гітара ёсць? Добра. Песні ведаеце? Выдатна. Чаго ж маўчым тады?» І загучала любімая песня...

Ён прыехаў да іх неспадзявана, Адольф Фёдаравіч Навумовіч, які стаў потым адным з самых любімых выкладчыкаў. Ён зразумеў, што калі не дапамагчы гэтым юнакам і дзяўчатам зараз, яны яшчэ доўга не змогуць зрабіць першы крок на шляху стварэння калектыву.

Ён дапамог ім зрабіць гэты самы першы крок — навучыў не губляцца ў складаных жыццёвых абставінах, не расслабляць сваю волю. І ўжо тады, на першай бульбе, упарта сталі прабівацца першыя парасткі давер'я, разумення. Паявіліся агульныя інтарэсы. Але гэта не быў яшчэ сапраўдны калектыў, паколькі працэс станаўлення калектыву вельмі хваравіты і працяглы. Ён толькі зараджаўся. Дружны калектыў. Трывалы...

Ім і на другі год пашанцавала на выдатнага кіраўніка. Фядэня не любіў кіслых, спахмурнелых людзей. Ён вырашыў з карэннямі знішчыць пустазелле пасіўнасці. Запрасіць рабят на сход пасля работы? А што ён дасць, гэты сход? Арганізавалі ж першакурснікі цікавую, здавалася б, гутарку «Раскажы мне аб сабе». А што з гэтага атрымалася? Усе аказаліся такімі сарамлівымі, што нават сказаць, дзе нарадзіліся і якую школу скончылі, не рашыліся, пакуль не прыпомнілі, што Люба Дударчык прапрацавала два гады на заводзе і, як самы старэйшы, умудроны жыццёвым вопытам чалавек, павінна выступіць першай. А ці патрэбны ён быў наогул гэты сход, расказы аб сваім нараджэнні і іншае? Скажыце, каму б з вас было прыемна і цікава расказваць сваю біяграфію перад шматлікай аўдыторыяй? Ды і не сціпла гэта.

Не, трэба стаць для іх старэйшым сябрам. Трэба, каб яны паверылі ў цябе. Сход адпаў. Міхаіл Міхайлавіч задумаў паставіць сельгасатрад на ўзровень будаўнічага. Але тут жа кіраўніку давялося вырашаць іншае пытанне: як іменна гэта зрабіць?

...Лес ужо спаў. А рабяты прыйшлі на ўзлесак, каб весяліцца. Ім было нялёгка сёння, але, радасныя, яны ішлі па кругу, узяўшыся за рукі, і прымушалі адзін аднаго адгадваць жаданні. А паколькі прачытаць чужыя думкі вельмі цяжка, набіралася вельмі шмат «штрафнікоў». Ад іх патрабавалася не шмат, але і не мала — выканаць без падрыхтоўкі мастацкі нумар...

Сапраўдны кіраўнік ведае моладзь і размаўляе са студэнтамі на роўных. Яго аўтарытэт залежыць не столькі ад прафесійных якасцей, колькі ад умення і жадання стаць для моладзі настаўнікам у вучобе, працы, жыцці.

Фядэня заўсёды мог паставіць сябе на месца студэнта, і таму ён ведаў, чаго чакае малады чалавек.

Кіраўнік навучыў іх галоўнаму, без чаго не можа быць сапраўднага калектыву, — самастойнасці. І зрабіў гэта вельмі тактоўна, незаўважна, так, каб рабяты не адчувалі той грані паміж студэнтамі і выкладчыкамі, якая часам перашкаджае самастойнаму мысленню, творчай рабоце. Іменна праз магчымасць самастойна мысліць, дзейнічаць, адчуваць студэнцкая група павінна ператварыцца ў добры калектыў.

А яшчэ кіраўніку, калі ён хоча стварыць калектыў, з самага пачатку трэба адмовіцца ад правядзення мерапрыемстваў у афіцыйных абставінах, адмовіцца ад звычкі, калі такая ёсць, навязваць студэнтам свае погляды — гэта адштурхоўвае.

...Рукі пакрыліся вялікімі мазалямі, перасохла ў роце, вочы зліпаліся ад стомленасці. Але яны так і не ляглі спаць у тую ноч. Не было электрычнасці — запалілі свечкі. Есці не хацелася — да двух гадзін ночы дзяўчаты прастаялі ля пліты. Ведалі: рабятам на такавішчы цяжэй, іх толькі шасцёра, і ім патрэбна гарачая страва. А яшчэ больш — цёплая сустрэча. Вы скажаце — выпадак? Не! Гэта ўжо быў сапраўдны калектыў.

**А. МОЗАЛЕВА,**
**студэнтка журфака.**

ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

# СЮРПРЫЗАЎ НЕ БЫЛО

**ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ вясенні крос у нашым універсітэце — старая і добрая традыцыя. Сёлета ён праходзіў на стадыёне універсітэцкага спорткомплексу. Але на гэты раз яго традыцыйнасць была крыху парушана, бо праводзіўся ён раней, чым звычайна. Наш няштатны карэспандэнт В. ШАЧАК папрасіў расказаць аб спаборніцтвах выкладчыка кафедры фізвыхавання В. Я. ШПІГАВА.**



— Кожны факультэт павінен быў выставіць для ўдзелу ў кросе 10 працэнтаў спартсменаў ад агульнай колькасці студэнтаў, якія займаюцца на дзённым аддзяленні. Акрамя таго, дазвалялася выставіць «запасны» забег — 15 чалавек, у якім таксама ўлічваліся лепшыя вынікі: у жанчын — на 500 метраў, у мужчын — на 1000 метраў. За выкананне нарматыву трэцяга разраду кожнаму ўдзельніку залічвалася 100 ачкоў. Агульная сума ўсіх вынікаў потым дзялілася на «залікову» колькасць удзельнікаў. Месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам:

| | |
|---|---|
| 1. Хімічны | —88,3; |
| 2. Фізічны | —86,9; |
| 3. Біялагічны | —85,6; |
| 4. Прыкладной матэматыкі | —85,3; |
| 5. Гістарычны | —84,5; |
| 6. Журналістыкі | —84,2; |
| 7. Філалагічны | —82,8; |
| 8. Радыёфізікі і электронікі | —80,2; |
| 9. Геаграфічны | —79,3; |
| 10. Механіка-матэматычны | —63,9. |

У асабістым заліку сярод жанчын перамагла студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Таццяна Крупянкова— адна мінута 28 секунд, другое месца ў Наталлі Сакаловай, першакурсніцы гістфака. Трэці прызёр — Жана Ратынская, студэнтка II курса факультэта прыкладной матэматыкі. Сярод мужчын пераможцам стаў пяцікурснік фізічнага факультэта Уладзімір Квач. Яго вынік — 2 мін. 35 сек. Другі прызёр— АляксандрВаўчок (IV курс, біяфак) — 2 мін. 38 сек. А вось трэцяе месца раздзялілі Міхаіл Пыж (ФПМ, V курс) і Аляксандр Жыльскі, другакурснік гістфака. Яны паказалі аднолькавы час—2 мін. 39 сек.

— Вельмі прыемна, што некаторыя факультэты выступілі паспяхова. З шостага месца падняліся на трэцяе біелагі, з сёмага на чацвёртае — факультэт прыкладной матэматыкі, з апошняга на шостае — журналісты. Вельмі добра выступілі хімічны і фізічны факультэты. А вось студэнты мехмата паказалі сябе зусім дрэнна. На месца старту не з'явілася 35 чалавек. Адсюль вынік —апошняе месца.

Галоўнае ўражанне ад кросу —масавасць. На ім стартавала 947 чалавек. І вельмі многія з іх выканалі нарматывы комплексу ГПА.

ПЛАВАННЕ

# ЭКЗАМЕН ВЫТРЫМАНЫ ПАСПЯХОВА

У ВОДНА-СПАРТЫЎНЫМ камбінаце горада Мінска прайшлі спаборніцтвы па плаванню.

Паспяхова выступіў на спаборніцтвах студэнт трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта майстар спорту СССР С. Грышэль, які заняў першае месца на дыстанцыі 200 метраў стылем батэрфляй. А студэнт трэцяга курса біялагічнага факультэта майстар спорту СССР І. Камлюк быў трэцім на дыстанцыі 200 метраў на спіне. На паўтаракіламетровай дыстанцыі вольным стылем другое месца заняў С. Ермаловіч (1-ы курс, фізфак).

З дзевяці заплываў, у якіх удзельнічалі нашы студэнты, у сямі былі паказаны вынікі на ўзроўні кандыдатаў у майстры спорту СССР.

Набраўшы 575 ачкоў, зборная каманда плыўцоў універсітэта заняла ў сваёй групе другое месца, прайграўшы камандзе ІФК (874 ачкі). Астатнія месцы занялі: політэхнічны інстытут (558 ачкоў), інстытут народнай гаспадаркі (531,5 ачка), радыётэхнічны інстытут (495 ачкоў) і ГДУ (374,5 ачка).

**М. КУЗЬМЯНКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

## ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

**«СЕЗОН ЗАКОНЧЫЎСЯ — ПРАБЛЕМЫ ЗАСТАЮЦЦА». Такі матэрыял быў надрукаваны ў нашай газеце 24 красавіка 1980 года. Рэдакцыя атрымала адказ:**

**«...кафедра фізічнага выхавання і спорту абмеркавала артыкул «Сезон закончыўся — праблемы застаюцца» сумесна са спартыўным клубам БДУ і згодна з праблемамі, якія закранае матэрыял: падбор і камплектаванне хакейнай каманды.**

**Практыка работы паказвае, што тая моладзь, якая прыходзіць займацца ў секцыю, вельмі слаба падрыхтавана як тэарэтычна, так і тэхнічна. І, як гаворыць аўтар, нават пры іх вялікім жаданні 5 гадоў мала, каб дасягнуць сярэдняга ўзроўню гульні.**

**Выхад з гэтага становішча бачыцца ў наступным: падбор таленавітых юнакоў са спартыўных секцый і ДЮСШ, якія мараць займацца ў БДУ.**

**Рашыць пытанне аб уключэнні ў праграму зімняй спартакіяды БДУ хакея ў цяперашні час нельга з-за адсутнасці спартыўнай формы і інвентару».**

КЛАСІЧНАЯ БАРАЦЬБА

# ЗАХАПЛЯЮЧЫЯ ПАЯДЫНКІ

У ГРОДНА праходзіла першынство ВНУ рэспублікі па класічнай барацьбе. Зборная каманда Белдзяржуніверсітэта выступала ў саставе 7 чалавек.

Цікавы фінальны паядынак правёў выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі майстар спорту СССР А. Канаў з кандыдатам у майстры спорту студэнтам Гродзенскага універсітэта А. Розумам. Пасля першых трох мінут лік быў 7:5 на карысць Канава. У другім перыядзе ён правёў каскад прыёмаў, і лік становіцца 15:10. У трэцім Розум набавіў тэмп, а Канаў трохі стаміўся, пачаў пасіўнічаць. Суддзі зрабілі яму заўвагу. Але на апошняй мінуце Канаў робіць кіданне прагібам і адрываецца ад праціўніка яшчэ на два балы. Прагучаў гонг, суддзя падымае руку Канава. Ён становіцца сярэбраным прызёрам першынства, а чэмпіёнам у гэтай вагавой катэгорыі стаў студэнт радыётэхнічнага інстытута кандыдат у майстры спорту Е. Новікаў.

Моцны састаў удзельнікаў падабраўся ў вагавой катэгорыі да 57 кілаграмаў. Нашу каманду прадстаўляў студэнт 1-га курса геаграфічнага факультэта кандыдат у майстры спорту А. Харанека. Пачаў ён спаборніцтвы з паражэння. Аднак праявіў сілу волі і дайшоў да фіналу. У ім А. Хараненка сустрэўся з С. Драчылеўскім з Гродзенскага універсітэта і перамог яго па балах, забяспечыўшы сабе сярэбраны медаль. А вось на «золата» яго не хапіла: ён прайграў І. Санжыеву — студэнту Гродзенскага універсітэта.

У вагавой катэгорыі 62 кілаграмы універсітэт выставіў двух удзельнікаў. Гэта старшы лабарант кафедры фізвыхавання В. Харук і студэнт хімічнага факультэта А. Міхальчанка. У другім крузе яны сустрэліся паміж сабой. Чыстую перамогу атрымаў В. Харук. Валявыя якасці ў гэтым першынстве праявіў В. Харук. Ён вёў барацьбу з В. Чарапко з Гродзенскага універсітэта. Паядынак пачаў агрэсіўна. Каскад прыёмаў ішоў адзін за другім. Пасля першага перыяду лік быў 7:0 на карысць В. Харука. У другім перыядзе адбылося непрадбачанае — ён траўміруе плячо. Што рабіць? Доктар прапаноўвае спыніць барацьбу, але Слава вырашае працягваць паядынак. Чарапко адчуў, што можа выйграць сустрэчу, і пачаў праводзіць прыём за прыёмам. У трэцім перыядзе, калі Чарапко пайшоў у адкрытую барацьбу, Харук усё ж дабіваецца чыстай перамогі. У фінале ён вёў барацьбу з першакурснікам тэхналагічнага інстытута кандыдатам у майстры спорту А. Герасімам. У першым жа перыядзе Харук перамагае і становіцца чэмпіёнам у вагавой катэгорыі да 62 кілаграмаў.

У вагавой катэгорыі да 74 кілаграмаў за наш калектыў выступіў майстар спорту Э. Шпігельман. Сустрэчу з майстрам спорту Е. Чучвай ён прайграў па балах, а вось у сустрэчы з вопытным барцом В. Ложкіным праявіў валявыя якасці і перамог. Аднак наступны паядынак са студэнтам ІФК В. Навумчыкам прайграў. Ён даў камандзе заліковыя ачкі і стаў пятым.

У паўцяжкай вазе каманду БДУ прадстаўляў студэнт 1-га курса юрыдычнага факультэта майстар спорту М. Рубіс. У першым паядынку ён сустрэўся з неаднаразовым чэмпіёнам і прызёрам БССР студэнтам Гродзенскага універсітэта Б. Сафаевым і прайграў па балах. Затым адзін паядынак выйграў чыста, адзін прайграў, заняўшы 5-е месца.

У самай цяжкай вагавой катэгорыі за каманду універсітэта змагаўся майстар спорту, член спортклуба А. Александровіч. Ён выйграў адзін паядынак, два прайграў і заняў 5-е месца.

Зборная каманда універсітэта набрала 211 ачкоў і заняла другое месца ў першай групе ВНУ рэспублікі, а ў агульным заліку — трэцяе месца, прапусціўшы наперад каманды Гродзенскага універсітэта і інстытута фізічнай культуры.

**В. ФЕФЕЛАЎ,**
**загадчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

З нашай пошты

# Аналізуючы пройдзенае

Завяршаецца чарговы навучальны год. У камітэтах камсамола падводзяцца вынікі работы за прайшоўшы час, намячаюцца планы на будучае.

Значную работу правялі за гэты перыяд пражэктарысты юрыдычнага факультэта. Улічваючы мінулагодняе сёмае месца ў спаборніцтвах «Камсамольскіх пражэктараў» універсітэта, наш штаб прыклаў усе намаганні, каб выправіць становішча.

Яшчэ ў пачатку навучальнага года мы ўключылі ў штаб вопытных пражэктарыстаў А. Шаўкера, С. Ласкевіча, арганізавалі пасты «КП» на курсах, у інтэрнаце № 4. Асноўныя намаганні былі сканцэнтраваны на рашэнні дзвюх-трох важных праблем. Гэта — унутраны распарадак і санітарны стан інтэрната № 4, вучэбная дысцыпліна (барацьба з адстаючымі ў вучобе, прагульшчыкамі), работа чытальнай залы і інш. На працягу года праведзена 40 рэйдаў-праверак. Штаб 15 разоў пасылаў сігналы на рэагаванне. У практыку ўвайшлі індывідуальныя гутаркі са студэнтамі, члены штаба «КП» пастаянна прысутнічалі на пасяджэннях камітэта камсамола, прафбюро, студсавета, неаднаразова выступалі на партыйных і камсамольскіх сходах.

Значна актывізавалася работа сектара галоснасці. Па матэрылах рэйдаў выпушчана 7 нумароў «КП», 5 «баявых лісткоў», 10 «маланак». Узрасла якасць афармлення сродкаў галоснасці.

Неабходна адзначыць, што палепшылася к канцу года работа студсавета інтэрната, дзе пражываюць нашы студэнты, павысілася паспяховасць у вучобе, лепш пачала працаваць чытальная зала. Узрасла і аператыўнасць выступленняў.

Адзначаючы станоўчае, не хочацца закрываць вочы і на некаторыя недахопы ў рабоце. На жаль, у нас яшчэ слабая сувязь з групай народнага кантролю факультэта. А, як паказвае вопыт работы іншых штабаў, эфектыўнасць дзеянняў ад сумеснай работы значна ўзрастае. Не наладжаны таксама яшчэ строгі кантроль за поўным выкараненнем ускрытых недахопаў. Неабходна, каб рубрыка «Па слядах нашых выступленняў» знайшла пастаянную прапіску ў нумарах «КП».

На працягу ўсяго года мы імкнуліся зрабіць «Камсамольскі пражэктар» баявой, дзейснай сілай.

**С. БРОЎКА,**
**старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» юрыдычнага факультэта.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 15195. Заказ 825.

22 мая 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ